Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# Добрушскі край

27 снежня 2017 года Серада

№97 (10720)

С МЕСТА СОБЫТИЯ

# Очарование новогодней сказки




**Сезон новогодних мероприятий в этом году районный Дворец культуры открыл так называемой «Председательской елкой», финансовую поддержку в организации мероприятия оказал райисполком. Первыми зрителями музыкального представления «Аленький цветочек» стали дети с особенностями развития, воспитанники приемных семей, детских домов семейного типа и приюта социально-педагогического центра. Одетые в карнавальные костюмы, с замиранием сердца они ожидали начала сказки. И она не разочаровала.**

Маленькие зрители внимательно следили за развитием событий. Искренне переживали за главных героев и, не жалея ладошек, аплодировали Настеньке и Чудовищу. Кульминацией представления стали превращения Чудовища в прекрасного принца и сольный танец Аленького цветка. Театрализованное представление, а точнее мюзикл, вызвало бурю эмоций не только у детей, но и у их родителей.

Следует отметить, что насыщенность представления музыкальными и танцевальными номерами, продуманной подсветкой и спецэффектами давно является отличительной особенностью новогодних праздников во Дворце культуры.

С финальными аккордами спектакля праздник не закончился. Веселье продолжилось в танцевальном зале, где малышей ожидали теперь уже новогодние герои – Дед Мороз и Снегурочка, Баба Яга и Снеговики. Множество конкурсов, возможность рассказать Деду Морозу стишок и получить сладкий подарок убедили детей в сказочности происходящего. Они с удовольствием водили хоровод вместе с председателем Добрушского райисполкома Ольгой Мохоревой и главными героями «Аленького цветка».

– Эту постановку планируем показать как можно большему количеству зрителей, – после праздника поделилась планами заведующая детским сектором районного Дворца культуры Ольга Шигалева. – По предварительным заявкам артистам придется выходить на сцену не менее десяти раз. Желание увидеть музыкальную сказку уже высказали все городские школы и несколько сельских.

**Сергей ЧАЙДАК**
**Фото Евгения УСТИНОВА**

## ВЕСТКІ З МЕСЦАЎ

### Школьныя забавы

**Больш за 20 школьных лагераў пачалі работу ў дні зімовых канікулаў. Па інфармацыі аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама, наведваць іх будуць каля 550 школьнікаў.**

Восем дзён, у якія будуць працаваць школьныя лагеры, рабяты будуць удзельнічаць у шэрагу мерапрыемстваў. У іх ліку – цікавыя майстар-класы, экскурсіі. Так, напрыклад, для ўдзельнікаў лагера ў СШ №2 запланавалі паездку ў эколага-біялагічны цэнтр у Гомелі.

**Наталля ХАДУНЬКОВА**

### Марафон дабра

**У гімназіі прайшоў штогадовы дабрачынны марафон. Акцыі, накіраваныя на дапамогу дзецям-інвалідам, праводзіліся ва ўстанове адукацыі на працягу месяца.**

– Марафон арганізаваны па праграме супрацоўніцтва гімназіі і цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання, – расказвае намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Алена Цугаева.

Пачаўся ён паказам роліка выпускніка гімназіі Дзмітрыя Шустава “Жыві”. Вучням абвясцілі імёны дзяцей, для якіх арганізавалі збор дапамогі. Яна магла быць рознай. Так, сабралі цацкі, кнігі. Некаторыя бацькі набылі вялікія наборы канцтавараў. Завяршальным мерапрыемствам стала правядзенне дабрачыннай ярмаркі.

Аўапошнія дні года валанцёры гімназіі з прыемнай місіяй наведаюць дзяцей-інвалідаў і уручаць ім падарункі.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**

### Пыласос ад прафсаюза

**Раённаму аб'яднанню прафсаюзаў выдзелены пэўныя сродкі для аказання матэрыяльнай дапамогі.**

Як паведаміла старшыня аб'яднання Наталля Доля, у бліжэйшыя дні на прэзідыўме савета раённага аб'яднання прафсаюзаў будзе разгледжана пытанне аб аказанні дапамогі сацыяльна-педагагічнаму цэнтру. Пры выбары навагодняга падарунка тут пастараліся ўлічыць патрэбы ўстановы адукацыі. Прапанавана набыць для іх пыласос.

**Тацццяна АХРАМЕНКА**

ISSN 2073-1000

**ПОГОДА**

**Долгота дня 7.42**
**Луна**
**27 декабря — в Овне,**
**28, 29, 30 — в Тельце**



**Полнолуние 2 января**

| 28 декабря | 29 декабря |
|---|---|
| **НОЧЬЮ +1…+3** | **НОЧЬЮ +5…+7** |
| **ДНЕМ +2…+4** | **ДНЕМ +6…+8** |
| Сплошная облачность. | Сплошная облачность. |
| Без осадков. | Небольшой дождь. |
| Ветер ю.-восточный, 5-7 м/с | Ветер ю.-восточный, 7-9 м/с |

КАЛОНКА РЭДАКТАРА

# Ставім на дружбу

Не зусім звычайны ліст атрымала рэдакцыя на мінулым тыдні. З пасёлка Фаніпаль. Адрасант – наша зямлячка Тамара Шаўчэнка. Некалі яна працавала ў добрушскім вучылішчы, актыўна супрацоўнічала з раёнкай, дасылала нам цікавыя інфармацыі і матэрыялы. Ужо не адзін год жыве на Міншчыне, але, гэта дакладна вядома, па-ранейшаму актыўна цікавіцца навінамі раёна. “У канцы лета даведалася, што цяпер “Добрушскі край” можна атрымліваць у любым куточку Беларусі, – піша жанчына. – Падпісалася на паўгода. Дасылаю падпісную квітанцыю, каб паўдзельнічаць у рэкламнай акцыі “Добрушскага краю”. Можа, удача мне ўсміхнецца...”. У працяг – навагоднія пажаданні газетчыкам.



Дарэчы: гэта далёка не адзінае цёплае пасланне, што ў пісьмовым і вусным варыянтах у гэтыя пераднавагоднія дні атрымліваюць супрацоўнікі “ДК”. Дзякуй іх аўтарам за ўвагу. Яна пераконвае: журналісцкі хлеб ядзім не дарэмна.

Насамрэч, для гэтай перадсвяточнай размовы, словамі вядомага шлягера спевака Ігара Мікалаева, ёсць пяць прычын. А мажліва і больш. Як і ў кожнага з вас, чытачоў “ДК”, у газетчыкаў навагоднія чаканні традыцыйна суправаджаюцца падсумоўваннем набыткаў адыходзячага года, мадэляваннем новых планаў. Паспрабуем напярэдадні самага любімага народнага свята асэнсаваць разам пройдзены шлях даўжынёй у год. З вамі, нашымі найлепшымі дарадцамі і сябрамі, чыю падтрымку мы, газетчыкі, выразна адчувалі ўвесь гэты час.

Надзвычай удзячны, што вы, не важна як – па тэлефоне, у лістах ці пры асабістых стасунках з журналістамі – былі гранічна шчырымі і заўсёды адкрытымі да дыялогу. І пры традыцыйных экспрэс-апытаннях па хвалюючых жыццёвых тэмах. І ў сустрэчах з журналістамі падчас рэалізацыі нашага праекта “Деревенька моя”, што атрымаў шырокі станоўчы рэзананс сярод чытачоў. І нават у просьбах аб дапамозе ў вырашэнні той ці іншай праблемы, звернутых да рэдакцыі. Удзячныя, што заробленым розумам і мазалём рублём вы зноў галасуеце за працяг сяброўства з раёнкай. Да слова, ход бягучай падпісной кампаніі даказвае, што не сотні – тысячы жыхароў Добрушчыны ў моры друкаваных выданняў жадаюць бачыць сваёй настольнай кнігай, дакладней, настольнай газетай, менавіта “Добрушскі край”. Ганарымся падпісчыкамі з Леніна, іх прыкметна прыбавілася ў параўнанні з мінулагоднім. Пабольшала сяброў выдання ў Жгуні, Ігаўцы, сярод камунальнікаў і медыкаў, у некаторых іншых калектывах. Больш за 200 нашых старых і новых сяброў, выдаўшы мандат даверу раённым газетчыкам на паўгоддзе 2018-га, прадаставілі ўжо ў рэдакцыю падпісныя квітанцыі – своеасаблівыя пропускі да ўдзелу ў рэкламнай акцыі сярод падпісчыкаў. Нехта спяшаецца гэта зрабіць у бліжэйшыя некалькі дзён да завяршэння падпіскі.

Нагадаем: пыласос, прас, міксер, фен і напольныя вагі чакаюць сваіх шчаслівых уладальнікаў. Вызначым самых удачлівых з вас пасля навагодніх святаў у студзені. Тым не менш, хочам заспакоіць астатніх: і тыя, каму ў гэты раз не ўсміхнецца прызавая ўдача, у пройгрышы не застануцца. Па-першае, газета – са свежымі навінамі і цікавымі матэрыяламі будзе рэгулярна ў новым паўгоддзі завітваць у ваш дом ці кватэру. Па-другое, увесь наступны год вы зможаце жыць, звяраючы сваю штодзённую хаду па насценным календары “Добрушскага краю”. Менавіта такі прыгожы ўкладыш-падарунак у якасці бонуса рэдакцыя падрыхтавала ўсім, хто аформіць падпіску на 2018 год.

У багажы набыткаў адыходзячага года, вядома ж, не толькі выпускі “Деревеньки...”, экскурсы ў гісторыю са “Старым альбомам”, паглыбленне журналістаў у “нетры” іншых прафесій, дапамога друкаваным словам у вырашэнні бытавых і вытворчых праблем, пытанняў добраўпарадкавання. Плёнам намаганняў калектыву рэдакцыі і крэатыўнага падыходу кіраўніцтва філіяла №10 “Гомельаблаўтатрансу” на вуліцах Добруша з’явіўся “фірменны” аўтобус з атрыбутыкай “Добрушскага краю”. Больш таго, дзясяткам гараджан тыдзень таму назад удалося стаць удзельнікамі наладжанага рэдакцыяй пераднавагодняга рэкламна-музычнага флэшмоба на колах. У якасці яго галоўных персанажаў – Дзеда Мароза і Снягуркі – выступілі журналісты выдання. Прызнаемся, дарагога каштуе, калі на трэцім-чацвёртым прыпынку маршрута ўваходзячых у салон сустракаў дружны хор з пасажыраў і ўдзельнікаў акцыі, што выконвае вядомае з маленства “У леса на опушке...”, “Если с другом вышел в путь”, “Ой, мороз, мороз...” і іншыя напоўненыя дабрынёй мелодыі...

Не станем стамляць, распавядаючы пра задумкі і праекты, якія будзем рэалізоўваць у 2018-м. Заўважым толькі: разам з вамі, шаноўныя чытачы, мы адолеем многае і шмат чаго зможам. Таму ў надыходзячым годзе мы, газетчыкі, як і раней, ставім на дружбу і плённае супрацоўніцтва з чытачамі “ДК”.

Міхаіл Жванецкі неяк сказаў: не заўсёды мудрасць прыходзіць з узростам, іншым часам узрост прыходзіць адзін. Перафразуючы выказванне сатырыка ў гэтыя фінішныя дні падпіскі, носім спадзяванне, што ў ваш дом, шаноўныя сябры, новы год не прыйдзе адзін. Без вашага “Добрушскага краю”...

**Мікалай ЖДАНОВІЧ,**
**галоўны рэдактар газеты “Добрушскі край”**




# Впереди – регистрация кандидатов

**В четверг вечером Добрушской районной избирательной комиссией по выборам депутатов районного Совета депутатов двадцать восьмого созыва принято решение о регистрации инициативных групп граждан по сбору подписей избирателей для выдвижения кандидатами в депутаты районного Совета депутатов. По словам председателя Добрушской районной избирательной комиссии Натальи Абросимовой, всего зарегистрировано 35 инициативных групп.**

– Выдвижение кандидатов в депутаты путем сбора подписей – один из самых популярных и простых способов, – говорит она. – Достаточно зарегистрировать группу из 3-10 граждан, получить удостоверение, и можно начинать собирать подписи в поддержку своего кандидата.

Список зарегистрированных инициативных групп уже размещен на официальном сайте Добрушского райисполкома. Анализируя данные кандидатов в депутаты, можно отметить: все они – беспартийные. В состав районного Совета депутатов желают войти как руководители предприятий и организаций города и района, так и обычные граждане. Нет четкого деления и по профессиям: учителя, водители, предприниматели, медицинские работники...

По словам собеседницы, многие кандидаты в депутаты избрали не менее популярный способ выдвижения – от трудового коллектива. На общих собраниях своих руководителей выдвинули правоохранители, спасатели, работники фарфорового завода и хлебозавода... Не остались в стороне от такого важного политического события и коммунисты района. Кандидатом в депутаты они выдвинули первого секретаря районной организации КПБ Екатерину Болюнову.

– Отмечу: создание инициативных групп вовсе не означает непременную регистрацию их выдвиженцев как кандидатов в депутаты, – пояснила Наталья Абросимова. – Решение о регистрации будет принято районной комиссией по выборам с 9 по 18 января следующего года. Не позднее 8 января кандидаты должны представить в комиссию все необходимые документы. У нас будет время на их проверку и принятие решения.

Собеседница также напомнила: до момента регистрации запрещается заниматься предвыборной агитацией. Что касается депутатства, то депутатом местного Совета депутатов может быть избран гражданин Республики Беларусь, достигший 18 лет, если он не имеет судимости и проживает на территории соответствующей административной единицы или связан с ней в силу профессиональной деятельности. Также вправе выдвигаться граждане России, постоянно проживающие на территории Беларуси.

**Сергей ЧАЙДАК**

НА СВЯЗИ

**29 декабря**
**с 13.00 до 14.00**
в Добрушском районном исполнительном комитете по ул. князя Ф.И.Паскевича, 11 (кабинет № 16) личный прием проведет Олег Иванович ЯДРЕНЦЕВ, член Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь

* * *

**30 декабря**
**с 9.00 до 12.00**
**по телефону 3-00-00**
прямую телефонную линию с жителями района проведет Руслан Владимирович СИКОРСКИЙ, заместитель председателя райисполкома.

* * *

**28 декабря**
**с 11.00 до 12.00**
**по телефону 7-14-19**
пройдет прямая телефонная линия с участием Александра Федоровича ВАСЬКОВЦОВА, директора Добрушского филиала КУП «Гомельоблтопливо».

В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ

# Инвестиции в будущее

**Президент Беларуси Александр Лукашенко подписал декрет «О развитии цифровой экономики»**



По словам Президента, главная цель документа – создать такие условия, чтобы мировые IT-компании приходили в Беларусь, открывали свои представительства, центры разработок и создавали востребованный в мире продукт. «Вторая цель декрета – инвестиции в будущее. Это IT-кадры и образование. Третья – внедрение новейших финансовых инструментов и технологий. Ведущие экономики мира еще только присматриваются к этому новому явлению. Беларусь становится фактически первым в мире государством, которое открывает широкие возможности для использования технологии блокчейн. У нас есть все шансы стать региональным центром компетенций в этой области», – заявил Александр Лукашенко.

Глава государства отметил, что он поддержал все предложения предпринимателей, какие бы сложные темы они ни затрагивали. «Есть у нас продвинутые люди, которые уже подумали, как этим заниматься. Я подумал так: у нас сегодня этого нет, если что-то будет хорошее – в плюс, если будет в минус – я знаю, с кого спросить», – сказал он. Более того, заметил Президент, с принятием декрета в Беларуси не только будут созданы условия для развития IT-сферы, но и приобретены уникальные конкурентные преимущества для привлечения технологий, капиталов и, главное, умных и талантливых людей со всего мира.

**По материалам БелТА**